**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
УА «ГДУ ім. Ф. Скарыны»

________________ І.В. Семчанка
______________________

Рэгістрацыйны № УД-_________________/вуч.

# ГІСТОРЫЯ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН НАВЕЙШАГА ЧАСУ

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці**
**1-21 03 01-01 Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2015

Вучэбная праграмаскладзена на аснове адукацыйнага стандарту "Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 03 01 Гісторыя (па напрамках)" і вучэбнага плана УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны" рэгістрацыйны № D 21-05-13, дата зацвярджэння 29.08.2013.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Р.Р. Лазько — прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», доктарт гістарычных навук, прафесар.

.

***Рэцэнзенты:***

М.Я. Абраменка — дэкан факультэта давузаўскай падгатоўкі УА «Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», к.г.н. дацэнт;

Старавойтаў М. І. – дацэнт кафедры гісторыі Беларусі УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай усеагульнай гісторыі УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»

(пратакол № 13 ад 26 мая 2015);

Навукова-метадычны савет універсітэта

(пратакол № 7 ад 27 мая 2015);

Адказны за рэдакцыю: **Р.Р. Лазько**

Адказны за выпуск: **Р.Р. Лазько**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Міжэтнічныя адносіны, з’яўляючыся важным сродкам пазнання чалавекам свету, служылі істотным і неабходным фактарам антрапа- і сацыягенеза. Іх ускладненне на пэўным этапе стала адной з прычын утварэння дзяржавы, якая прыняла на сябе асноўныя функцыі гэтых адносін – падтрыманне знешняй бяспекі, фарміраванне спрыяльных умоў для абменаў і узаемадзеяння з іншымі этнасамі, утвараючымі свае дзяржавы. Міждзяржаўныя адносіны сталі асноўным кампанентам міжнародных адносін, аднак не з’яўляюцца тоеснымі ім. У працэсе свайго развіцця міжнародныя адносіны надзвычай ускладніліся: сёння ў іх, акрамя блізка да двух соцень дзяржаў удзельнічаюць тысячы іншых суб’ектаў са сваімі задачамі, якія аказваюць істотны ўплыў на палітыку. Такі характар міжнародныя адносіны набылі на працягу ХХ стагоддзя пад уплывам мадэрнізацыі, двух глабальных катастроф – сусветных войнаў, якія павысілі адказнасць кожнага чалавека, асобных сацыяльных груп, за вынікі палітыкі дзяржаў, і пад уплывам глабальных праблем, узнікшых на пераходзе чалавецтва ад індустрыяльнага да інфармацыйна-тэхналагічнага грамадства. Важным ускладняючым кампанентам сучасных міжнародных адносін з’яўляецца таксама распад сацыялістычных таталітарных сістэм, які істотна мяняе палітычны ландшафт Еўропы і Азіі.

Вывучэнне сусветнай палітыкі і сучасных міжнародных адносін з’яўляецца неабходным звяном сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў па гістарычных спецыяльнасцях. Матэрыял гэтага курса выдатна адлюстроўвае складанасць гістарычнага працэсу, няспыннае ўзаемадзеянне ў ім аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў, яго полівар'янтнасць і альтэрнатыўнасць. Таму яго вывучэнне аб’ектыўна служыць дасягненню галоўнай стратэгічнай мэты гэтага ўзроўню навучання – фарміраванню спецыяліста, гатовага да самастойнай творчай дзейнасці ў сферы даследавання гісторыі і яе выкладання. Спецыяльная прадметная *мэта курса* заключаецца ў азнаямленні з міжнароднымі адносінамі і знешняй палітыкай дзяржаў як з асобнымі сферамі сацыяльнай дзейнасці людзей, якая ажыццяўляецца па-за дзяржаўнымі граніцамі.

Яго асноўныя *задачы* заключаюцца ў вывучэнні:

- заканамернасцей фарміравання і развіцця знешняй палітыкі, міждзяржаўных і міжнародных адносін, агульнага і спецыфічнага ў кожнай з гэтых сфер;
- фарміравання сістэмнасці ў міжнародных адносінах, уключаючы заканамернасці змены сістэм на матэрыяле міжнародных адносін ХХ стагоддзя;
- гістарычных умоў набыцця міжнароднымі палітычнымі адносінамі характару сусветнай палітыкі, заканамернасцей і этапаў яе развіцця;
- працэса краху двухполюснай сістэмы свету ў канцы ХХ стагоддзя, праблем фарміравання новай сістэмы на сучасным этапе;
- дзейнасці асноўных суб’ектаў міжнародных адносін рубяжа ХХ – ХХІ стагоддзяў (дзяржавы, групы дзяржаў, міжнародныя арганізацыі).

У выніку вывучэння курса студэнт абавязаны *ведаць:*

- сутнасць знешняй палітыкі і міжарожных адносін, ролю дзяржавы ў міжнародных адносінах;
- крытэрыі фарміравання сістэм міжнародных адносін і асноўныя іх гістарычныя формы;
- фактары знешняй палітыкі і міжнародных адносін;
- геаграфічныя ўзроўні міжнародных адносін;
- характар развіцця Версальскай сістэмы як незавершанага, пераходнага тыпу сістэмы міжнародых адносін;
- ролю СССР у сусветнай палітыцы як сістэмаўтвараючага і дэструктыўнага фактара на розных этапах яе развіцця;
- канструкцыю ялцінска-патсдамскай сістэмы і прычыны яе эвалюцыі ў двухполюсную сістэму свету;
- глабальныя праблемы чалавецтва як фактар міжнародных адносін пасля Другоой сусветнай вайны;
- гістарычныя ўмовы, прычыны, наступствы развалу двухполюснай сістэмы;

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

- характар сусветнай палітыкі і міжнародных адносін на мяжы XX – XXI стагоддзяў;
- ролю ААН, іншых міжнародных арганізацый у сучасным свеце;

*умець:*

- вызначыць прызнакі сістэмнасці ў міжнародных адносінах на розных этапах іх развіцця;
- праводзіць тыпалогію міжнародных адносін па розных крытэрыях;
- праводзіць спекулятыўную рэканструкцыю і параўнальны аналіз сістэм міжнародных адносін XX стагоддзя;
- прадставіць канструкцыю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, яе ролю ў сучасным свеце;
- вызначаць па карце асноўныя рэгіёны сучасных міжнародных адносін і канфліктныя зоны;

*валодаць:*

- методыкай навуковай крытыкі існуючай літаратуры па праграме курса;
- уменнямі пошуку, сістэматызацыі і аналізу матэрыяла крыніц па праграме курса;
- методыкай падрыхтоўкі навуковага даклада, напісання рэцэнзіі;
- уменнямі весці дыскусію па праблематыцы курса;
- уменнямі суадносіць гістарычныя і сучасныя палітычныя карты, выдзяляць на іх геапалітычныя рэгіёны, кантактныя і канфліктныя зоны ў міжнародных адносінах.

Вучэбная праграма з'яўляецца праграмай адной з дысцыплін па выбару. Яна вывучаецца студэнтамі 3 курса спецыяльнасці 1-21 03 01-01 "Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)" дзённай формы навучання. Дысцыпліна вывучаецца ў аб'ёме 68 гадзін, у тым ліку – 44 аўдыторных гадзіны (з іх 20 – лекцыйных гадзін, 16 – семінарскіх гадзін), КСР – 8 гадзін. Дысцыпліна вывучаецца на працягу шостага семестра, у канцы якога студэнты здаюць залік.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Раздзел 1. Тэарэтычныя пытанні гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі.

#### Тэма 1.1. Уводная: сутнасць міжнародных адносін, іх суб'екты і асноўныя фактары.

Міжэтнічныя адносіны ў працэсе сацыягенеза. Узнікненне дзяржавы. Палітызацыя міжэтнічных адносін. Дзяржава як асноўны суб'ект (актор) міжнародных адносін. Іншыя іх суб'екты. Дэмакратызацыя міжнародных адносін пад уплывам мадэрнізацыі.

Знешняя палітыка дзяржаў і міжнародныя адносіны. Іх розны якасны змест. Месца ідэалогіі ў знешняй палітыцы дзяржаў і ў міжнародных адносінах.

Фактары знешняй палітыкі і міжнародных адносін. Асяроддзе знешняй палітыкі і міжнародных адносін. Яго розны якасны характар у гэтых сферах. Геаграфічныя (прыродныя) фактары знешняй палітыкі. Геапалітыка як складовы элемент палітыкі і як навуковая дысцыпліна. Фактары эканамічнай сілы, іх эвалюцыя ў індустрыяльную і постіндустрыяльную эпоху. Ваенныя фактары знешняй палітыкі і міжнародных адносін, іх гістарычная эвалюцыя. Культурныя і псіхалагічныя фактары. Этнавобразы і этнастэрэатыпы. Вобраз ворага ў знешняй палітыцы. Маральныя фактары ў палітыцы як гістарычны фенамен. Міжнароднае права.

Геаграфія міжнародных адносін. Геаграфічныя ўзроўні міжнародных адносін: двухбаковыя, рэгіянальныя, кантынентальныя і сусветныя міжнародныя адносіны.

Міжнародныя адносіны ў Еўропе. Геаграфічнае і цывілізацыйнае паняцці Еўропы, іх несупадзенне. Цэнтральна-еўрапейскі і Усходнееўрапейскі рэгіёны на працягу стагоддзяў. Чарнаморска-балтыйскі субрэгіён.

#### Тэма 1.2. Сістэмнасць у міжнародных адносінах.

Паняцце сістэмы міжнародных адносін. Сістэмнасць як гістарычная з'ява. Нацыянальныя інтарэсы – асноўны сістэматызуючы фактар міжнародных адносін. Тыпалогія нацыянальных інтарэсаў. Нацыянальныя і дынастычныя, групавыя інтарэсы. Эвалюцыя іх суадносін у эпоху мадэрнізацыі. Дзяржава як суб'ект нацыянальных адносін, іх прадстаўнік у міжнароднай палітыцы.

Міжнародная палітыка як сфера выяўлення суверэнітэта дзяржаў. Фармальнае роўнапраў'е дзяржаў у міжнароднай палітыцы. Аб'ектыўная іх няроўнасць у гэтай сферы. Крытэрыі і гістарычны характар іерархіі дзяржаў. Вялікія дзяржавы ўчора і сёння. Звышдзяржавы. Сярэднія (рэгіянальныя) дзяржавы. Малыя і мікрадзяржавы. “Буферныя дзяржавы” ў Еўропе. Саюзы дзяржаў. Рэгіянальныя і сусветныя арганізацыі дзяржаў. Дзяржава і міжнародныя арганізацыі. Двухбаковыя і шматбаковыя дагаворы дзяржаў.

Гістарычныя формы сістэмы міжнародных адносін (Вестфальская і наступныя). Фактары інтэграцыі і дэзінтэграцыі сістэм.

Дыпламатыя – інструмент для правядзення знешняй палітыкі дзяржаў. Дыпламатычная служба.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

### Раздзел 2. Версальска-Вашынгтонская сістэма як сістэма сусветнай палітыкі.

#### Тэма 2.1. Міжнародныя адносіны на заключным этапе Першай сусветнай вайны.Пачатак фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.

Першая сусветная вайна як выява крызісу індустрыяльнай цывілізацыі. Рэвалюцыя 1917 г. ў Расіі – яшчэ адна выява гэтага крызісу. Пашырэнне пацыфісцкіх ідэй, ідэі права народаў на самавызначэнне, як рэакцыя на цывілізацыйны крызіс. Уступленне ЗША ў вайну. Спробы пераадолення крызісу шляхам сістэматызацыі сусветнай палітыкі. “14 пунктаў” В. Вільсона.

Кастрычніцкая рэвалюцыя і выхад Расіі з вайны. Ідэя сусветнай рэвалюцыі ў палітычнай практыцы бальшавікоў. Пытанне аб экспарце рэвалюцыі. Брэст-Літоўскія мірныя перагаворы. Брэсцкі мір і яго міжнародныя вынікі. Адпадзенне ад Расіі Украіны, Прыбалтыкі, Фінляндыі і Закаўказзя. Дадатковы дагавор паміж Савецкай Расіяй і Германіяй (жнівень 1918 г.). Пачатак інтэрвенцыі дзяржаў Антанты ў Расіі.

Ваенная кампанія 1918 г. і пералом у ходзе сусветнай вайны на карысць дзяржаў Антанты. Выхад з вайны саюзнікаў Германіі. Распад Аўстра-Венгрыі. Камп'енскае перамір'е. Ануляванне Савецкай Расіяй Брэсцкага мірнага дагавора.

**Тэма 2.2. Утварэнне Версальскай сістэмы міжнародных адносін. Версальская сістэма як незавершаны, пераходны тып *сістэмы міжнародных адносін.***

Падрыхтоўка і адкрыццё мірнай канферэнцыі ў Парыжы. Пазіцыі дзяржаў па пытаннях пасляваеннага мірнага ўрэгулявання. Утварэнне Лігі Нацый. Ідэалогія яе статута. Германскае і польскае пытанні на канферэнцыі. Версальскі мірны дагавор. Мірныя дагаворы з саюзнікамі Германіі – Аўстрыяй (Сен-Жэрменскі), Венгрыяй (Трыанонскі), Балгарыяй (Нэйіскі), Турцыяй (Сеўрскі). Утварэнне новых дзяржаў у Еўропе. Праблема іх граніц. Месца новых дзяржаў у Версальскай сістэме. Германія і Савецкая Расія (СССР) у Версальскай сістэме. Змена еўрапейскай палітыкі ЗША пасля Парыжскай канферэнцыі.

Сусветны характар Версальскай сістэмы. Спробы спалучэння маральных і палітычных крытэрыяў у яе структуры і дзейнасці. Слабасці механізма выканання Статута Лігі Нацый.

Фактары інтэграцыі і дэзінтэграцыі Версальскай сістэмы. Яе няўстойлівы характар.

**Тэма 2.3. Эвалюцыя Версальскай сістэмы ў сярэдзіне 1920-х гадоў.**

Суадносіны сіл у Еўропе пасля Парыжскай мірнай канферэнцыі. Усходнееўрапейскія ("тылавыя") саюзы Францыі. Рурскі крызіс 1923 г. і яго вынікі. Пачатак крызісу Версальскай сістэмы. Змена суадносін сіл паміж яе суб'ектамі. Страта Францыяй лідзіруючага становішча. Яе залежнасць ад Велікабрытаніі, пераход да кансерватыўнай абарончай палітыкі.

"План Дауэса" 1924 г. Барацьба Германіі за аднаўленне статуса вялікай дзяржавы. Палітыка двайных стандартаў заходніх дзяржаў адносна Заходняй і Ўсходняй Еўропы. Лакарнская канферэнцыя 1925 г. і яе рашэнні. Рэйнскі гарантыйны пакт. Уваходжанне Германіі ў Лігу Нацый.

**Тэма 2.4. Заходні свет і Савецкая Расія (СССР) у еўрапейскай палітыцы ў першай палове 1920-х гадоў.**

"Мірная перадышка" Савецкай Расіі ў пачатку 1920-х гадоў (мірныя дагаворы з Эстоніяй, Латвіяй, Літвой і Фінляндыяй). Польска-савецкая вайна і аднаўленне экспарту рэвалюыі. Рыжскі мір 1920 – 1921 гг. Адыход РСФСР ад палітыкі дзяржаўнага экспарту рэвалюцыі. Роля Камінтэрна. "Двухкаляёвая" знешняя палітыка савецкай дзяржавы ў 1920-я гады.

Праціўнікі і партнёры СССР па еўрапейскай палітыцы. Генуэзская канферэнцыя 1922 г. Гаагская канферэнцыя. Рапальская палітыка ў кантэксце Версальскай сістэмы.

Курс Камінтэрна на распальванне рэвалюцыі ў Германіі ў ходзе Рурскага крызісу. Правал гэтага курсу і яго ўплыў на міжнародную палітыку СССР. "Паласа прызнання" СССР заходнімі дзяржавамі (1924 г.). Адыход СССР ад палітыкі "расшывання" польскай дзяржавы па нацыянальных швах. Адносіны з іншымі заходнімі суседзямі. Берлінскі дагавор 1926 г.

**Тэма 2.5. Фарміраванне Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін і яе эвалюцыя да пачатку 1930-х гадоў.**

Змена суадносін сіл на Далёкім Усходзе на карысць Японіі ў выніку Першай сусветнай вайны. Далёкаўсходняе пытанне на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Япона-амерыканскія супярэчнасці. Вашынгтонская канферэнцыя 1921 – 1922 гг. і яе рашэнні. Дагаворы чатырох і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пяці дзяржаў. Дагавор дзевяці дзяржаў. ”Рускае пытанне” на Вашынгтонскай канферэнцыі. Уключэнне Далёкаўсходняй Рэспублікі ў склад РСФСР.

Палітыка Савецкай Расіі – СССР адносна Кітая як фактар дэстабілізацыі Вашынгтонскай сістэмы. Нацыянальная рэвалюцыя ў Кітаі 1925 – 1927 гг. і палітыка неўмяшання заходніх дзяржаў. Абвастрэнне савецка-кітайскіх адносін, іх разрыў у 1927 г. Узброены канфлікт на КВЖД (1927 г.).

Палітыка Японіі на Далёкім Усходзе. “Мемарандум Танакі” (1927 г.). Абвастрэнне палітычнай барацьбы ў Японіі па пытаннх знешняй палітыкі ў канцы 1920-х гг. Пераход да экспансіяністцкай палітыкі. Агрэсія Японіі ў Кітаі (Маньчжурыя) і ўтварэнне дзяржавы Маньчжоу-Го.

Версальская і Вашынгтонская сістэмы як звёны сусветнай сістэмы міжнародных адносін.

**Тэма 2.6. Міжнародныя адносіны ў Еўропе ў паслялакарнскі перыяд (1926 – 1932 гг).**

Лакарнскі працэс у другой палове 1920-х гадоў. Германскія планы тэрытарыяльнай рэвізіі Версальскага дагавора. Вяртанне Велікабрытаніі да палітыкі баланса ў міжнародных адносінах. Падтрымка ёю рэвізіяністцкіх планаў Германіі. Тэндэнцыя да вырашэння еўрапейскіх праблем па-за Лігай Нацый.

Праблема раззбраення ў міжнародных адносінах. Пацыфісцкі рух. Пакт Брыана – Келага 1928 г. Канферэнцыя па раззбраенні. Дэкларацыя пяці дзяржаў 1932 г. Пан’еўрапейскі рух. План “Пан-Еўропы” А. Брыана і яго правал.

Барацьба Германіі за адмену рэпарацый. “План Юнга”. Датэрміновы вывад заходнімі дзяржавамі акупацыйных войск з Рэйнскай зоны. Мараторый Гувера і адмена рэпарацый.

Тэрытарыяльна-нацыянальныя праблемы і Ліга Нацый. Пытанне аб “польскім калідоры” ў міжнароднай палітыцы. План Роберта Хэнкі.

Рапальская палітыка ў кантэксце Лакарна, яе затуханне на мяжы 1920-х – 1930-х гадоў. Змена геапалітычнага становішча СССР (Далёкі Ўсход, Польшча, Германія). Дылема “Германія – Антанта” ў сусветнай палітыцы СССР. Пачатак паварота ў савецкай знешняй палітыцы.

Крызіс Версальскай сістэмы.

**Тэма 2.7. Ад палітыкі калектыўнай бяспекі да блокавай палітыкі (сярэдзіна – другая палова 1930-х гадоў).**

Прыход да ўлады ў Германіі нацысцкай партыі, яе знешнепалітычная праграма, метады і этапы яе рэалізацыі. Праект пакта чатырох дзяржаў 1933 г. Паглыбленне крызісу Версальскай сістэмы. Выхад Германіі з Лігі Нацый. Тактычны паварот ў яе адносінах з Польшчай. Польска-германская дэкларацыя ад 26 студзеня 1934 г.

Курс СССР на збліжэнне з Захадам як тактычны паварот у савецкай знешняй палітыцы. Яго поліварыянтны характар. Дагаворы аб ненападзенні з Францыяй і з суседнімі еўрапейскімі дзяржавамі. Канвецыя аб вызначэнні агрэсара 1933 г. Праект сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе (“Усходні пакт”) і яго правал. Уступленне СССР у Лігу Нацый. Яго двухбаковыя дагаворы аб узаемнай дапамозе з Францыяй і Чэхаславакіяй 1935 г.

Барацьба Германіі супраць Версальскай сістэмы. Разрыў ёю абавязацельстваў, узятых па міжнародных дагаворах (ваенных абмежаванняў, дэмілітарызаванага статуса Рэйнскай зоны – 1935, 1936 гг.) Пачатак тэрытарыяльных змен у Еўропе і ў свеце. Агрэсія Італіі супраць Эфіопіі. Рэакцыя на яе заходніх дзяржаў. Пачатак італа-германскага збліжэння. Грамадзянская вайна ў Іспаніі і ўмяшанне ў яе фашысцкіх дзяржаў. Палітыка неўмяшання ў грамадзянскую вайну ў Іспаніі і пазіцыя СССР.

Пачатак фарміравання агрэсіўных блокаў: германа-італьянскае палітычнае пагадненне (“вось Берлін – Рым”, кастрычнік 1936 г., германа-японскі Антыкамінтэрнаўскі пакт - лістапад 1936 г., далучэнне да яго Італіі). Выход Італіі з Лігі Нацый (1937 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Неэфектыўнасць Лігі Нацый у міжнародных канфліктах другой паловы 1930-х гадоў. Палітыка замірэння Германіі заходнімі дзяржавамі: мэты і вынікі. Яе антысістэмны характар.

**Тэма 2.8. Міжнародныя адносіны на Далёкім Усходзе ў 1930-я гады.**

Расшырэнне Японіяй агрэсіі ў Паўночна-Усходнім Кітаі.Пазіцыя заходніх дзяржаў. Дактрына Сцімсана. Маньчжурскае пытанне ў Лізе Нацый. Выхад Японіі з Лігі Нацый (1933 г.).

Савецка-японскія і савецка-кітайскія адносіны ў пачатку 1930-х гадоў. Нармалізацыя савецка-кітайскіх адносін. Японскі фактар пры ўстанаўленні дыпламатычных адносін паміж СССР і ЗША (лістапад 1933 г.). Праект Ціхаакіянскага пакта. Пытанне аб КУЧ (КВЖД), яе продаж Маньчжоу-го ў 1935 г.

Савецка-мангольскія і савецка-кітайскія адносіны ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Савецка-мангольскае пагадненне аб узаемнай дапамозе (1934 – 1936 гг.). Сіньцзянскае пытанне і пытанне аб Кампартыі Кітая (КПК) ў савецка-кітайскіх адносінах. Паварот КПК да супрацоўніцтва з урадам Чан Кайшы на антыяпонскай аснове.

Пачатак японa-кітайскай вайны (1937 г.). Зварот Кітая ў Лігу Нацый. Брусельская канферэнцыя і яе правал. Японa-германскае супрацоўніцтва і яго межы. Пагадненне Арыта – Крэйгі – “далёкаўсходні Мюнхен”. Савецка-кітайскае збліжэнне. Дагавор аб ненападзенні 1937 г. Абвастрэнне савецка-японскіх адносін. Узброеныя канфлікты на возеры Хасан (1938 г.) і на рацэ Халхін-гол (1939 г.), іх еўрапейскі рэзананс.

**Тэма 2.9. Крах Версальскай сістэмы ў канцы 1930-х гадоў .**

Аншлюс Аўстрыі Германіяй. Чэхаславацкі крызіс 1938 г., пазіцыя заходніх дзяржаў і СССР. Пазіцыя Польшчы ў сувязі з міжнароднымі канфліктамі 1938 г. Перагаворы Н. Чэмберлена з Гітлерам аб перадачы Судзецкай вобласці Германіі. Мюнхенская канферэнцыя чатырох заходніх дзяржаў і яе рашэнні. Ультыматум Польшчы Чэхаславакіі і яго прыняцце. Англа-германская і франка-германская дэкларацыі аб ненападзенні Палітычная ізаляцыя СССР.

Разрыў Германіяй Мюнхенскіх пагадненняў і ліквідацыя Чэхаславакіі. Міжнародны палітычны крызіс 1939 г. Грамадская думка ў Англіі і Францыі супраць палітыкі прымірэння з Германіяй. Адыход урадаў ад гэтай палітыкі. Гарантыі Англіі і Францыі дзяржавам Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Пацвярджэнне Францыяй саюза з Польшчай і заключэнне Англіяй саюза з ёю. Спроба заключэня англа-франка-савецкага саюза. Палітычныя і ваенныя перагаворы трох дзяржаў. Польскі, румынскі і прыбалтыйскі фактары на перагаворах. Неафіцыйныя англа-германскія перагаворы. Выбар СССР на карысць дагавора з Германіяй, яго падрыхтоўка і падпісанне. Сакрэтны пратакол як інтэгральная частка дагавора. Значэнне дагавора для Германіі і СССР, яго міжнародныя вынікі.

Урокі гісторыі Версальскай сістэмы.

**Раздзел 3. Міжнародныя адносіны ў перыяд і пасля Другой сусветнай вайны.**

**Тэма 3.1. Міжнародныя адносіна на першым этапе Другой сусветнай вайны**

Пачатак Другой сусветнай вайны. Мэты яе ўдзельнікаў. Разлікі СССР на зацягванне вайны. Уключэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР і новы падзел Польшчы. Савецка-германскі дагавор аб дружбе і граніцы ад 28 верасня 1939 г. Савецка-фінляндская вайна і яе вынікі. Крах Лігі Нацый.

Тэрытарыяльныя перамены ў Еўропе і ў свеце на першым этапе Другой сусветнай вайны. Разгром і капітуляцыя Францыі. Уключэнне Прыбалтыкі, Бесарабіі і Паўночнай Букавіны ў склад СССР. Англа-амерыканскія адносіны. Закон аб ленд-лізе.

Германскія і савецкія планы стварэння новай сістэмы міжнародных адносін. Месца ў іх Балтыйска-Чарнаморскага субрэгіёна. Дыпламатычная барацьба паміж Германіяй і Англіяй за СССР на першым этапе вайны. Савецка-германскія перагаворы і іх правал. План “Барбароса”. Пачатак германа-савецкай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Тэма 3.2. Міжнародныя адносіны ў 1941- 1945 гг. Пачатак фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.**

Атлантычная хартыя. Далучэнне СССР да яе. Англа-савецкія адносіны ў 1941 г. Польскае пытанне ў гэтых адносінах. Нападзенне Японіі на ЗША і ўступленне ЗША ў вайну. Утварэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Дэкларацыя Аб’яднаных Нацый.

Пытанне аб другім фронце ў Еўропе ў адносінах дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. Высадка сіл заходніх саюзнікаў у Афрыцы (лістапад 1942 г.) і ў Італіі (ліпень 1943 г.), пераход Італіі на бок саюзнікаў. Маскоўская канферэнцыя міністраў замежных спраў трох дзяржаў (кастрычнік 1943 г.). Тэгеранская канферэнцыі “вялікай тройкі” (лістапад – снежань 1943 г.). Пытанні пасляваеннага мірнага ўладкавання ў адносінах дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. Германскае, польскае, іншыя пытанні. Праблема прызнання тэрытарыяльных набыткаў СССР ва Ўсходняй Еўропе. Уплыў на яе рашэнне германскага і японскага фактараў.

Адкрыццё другога фронта ў Еўропе. Раскол і аслабленне фашысцкага блока к канцу 1944 г. Рост уплываў СССР у Еўропе і ў свеце. Меры СССР па сатэлізацыі краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Крымская (Ялцінская) канферэнцыя і яе рашэнні. Капітуляцыя Германіі. Патсдамская канферэнцыя і яе рашэнні. Капітуляцыя Японіі, завяршэнне Другой сусветнай вайны.

**Тэма 3.3. Узнікненне двухполюснай сістэмы свету.**

Тэрытарыяльныя змены ў Еўропе і свеце пасля Другой сусветнай вайны. Акупацыйны рэжым у Германіі. Новыя суадносіны сіл. Утварэнне ААН. Статут ААН. Брэтан-Вудская валютная сістэма.

Пытанне аб мірных дагаворах з Германіяй і Японіяй. Падрыхтоўка і падпісанне мірных дагавораў з саюзнікамі Германіі (Парыжскія дагаворы). Сан-Францыскі мірны дагавор з Японіяй (1951 г.).

Тэрытарыяльная экспансія СССР у Еўропе і Азіі пасля Другой сусветнай вайны. Палітыка ЗША і Велікабрытаніі па “стрымліванні камунізма”. План Маршала. Савецкая ідэя двух супрацьлеглых лагераў і ўтварэнне Камінфарма. Пачатак “халоднай вайны”.

**Тэма 3.4. Міжнародныя адносіны ва ўмовах глабальнай канфрантацыі 1950-х – 1970-х гадоў.**

Раскол Германіі. Утварэнне двух ваенна-палітычных блокаў. Германская праблема ў 1950-я – пачатку 1960-х гадоў. Глабальная канфрантацыя СССР і ЗША. Лакальныя войны і канфлікты. Вайна ў Карэі. Карыбскі крызіс. Вайна ва В’етнаме. Гонка звычайных і ядзерных узбраенняў.

**Тэма 3.5. Глабальныя праблемы чалавецтва.**

Урокі Другой сусветнай вайны. Рост уплываў масавых рухаў у палітыцы. Чалавецтва перад новымі выклікамі. Ядзерная зброя – параджэнне сусветнай вайны і зброя халоднай вайны. Праблема ядзернай катастрофы. Масавы антываенны рух і палітыка дзяржаў. Праблема недахопу харчовых рэсурсаў. Голад у краінах “трэцяга свету”. Недахоп іншых прыродных рэсурсаў і нерацыянальнае іх выкарыстанне. Пагроза экалагічнай катастрофы.

Рост масавых захворванняў. Масавыя рухі за аздараўленне жыццёвага асяроддзя. Міжнародны тэрарызм як глабальная праблема: ідэалогія, геаграфія, наступствы. ААН і глабальныя праблемы чалавецтва.

**Тэма 3.6. Распад двухполюснай сістэмы свету.**

Чалавецтва на парозе інфармацыйна-тэхналагічнай цывілізацыі. Няздольнасць сацыялістычных краін эфектыўна асвоіць інфармацыйныя тэхналогіі ва ўмовах панавання таталітарных дыктатур. Распад гэтых дыктатур ва Ўсходняй Еўропе на мяжы 1980-х – 1990-х гадоў. Пройгрыш СССР гістарычнага спаборніцтва Захаду. “Перастройка”. Адступленне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

СССР ў Еўропе. Аб’яднанне Германіі. Аднаўленне ёю суверэнітэта. Ліквідацыя Арганізацыі Варшаўскага Дагавора і Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (1991 г.). Вяртанне ў сусветную палітыку рэгіёна Цэнтральнай Еўропы. Распад СССР. Слабасць Расіі. НАТО і ЗША ў Еўропе пасля развалу савецкага блока. Аднаполюсная сістэма свету, яе няўстойлівасць, праблема фарміравання многаполюснай сістэмы. Новыя цэнтры сілы ў сусветнай палітыцы на сучасным этапе.

**Тэма 3.7. Еўрапейская і сусветная інтэграцыя (да пачатку 20 ст.).**

Пераход заходняга свету ад індустрыяльнай да інфармацыйна-тэхналагічнай стадыі ў сваім развіцці. Глабалізацыя. Рухаючыя фактары еўрапейскай інтэграцыі, яе этапы. Інтэграцыйныя працэсы ў іншых рэгіёнах свету. Дзейнасць міжнародных арганізацый. Маастрыхтскія пагадненні. Рост рэальнага адзінства Еўропы, іншых рэгіёнаў свету, і яго адлюстраванне ў свядомасці людзей.

Маастрыхтскі працэс у 1990-я гады. Еўрапейскі Саюз, яго структура. Еўрапейская супольнасць. Крах таталітарных рэжымаў у краінах Усходняй Еўропы як фактар еўрапейскай інтэграцыі. Прынясце былых сацыялістычных краін у НАТО і ЕС. Утварэнне Рэспублікі Беларусь і яе міжнароднае прызнанне. Рэспубліка Беларусь у сучасным свеце. Роля вядучых развітых дзяржаў у сучасным свеце. Дзяржавы “сямёркі” (“васьмёркі”). БРІК (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай). Інстытуты міжнароднага супрацоўніцтва на сучасным этапе: Сусветная гандлёвая арганізацыя, Міжнародны валютны фонд і інш.

*Праблема ўстойлівага міжнароднага развіцця на сучасным этапе.* Прычыны няўстойлівасці: беднасць, рэлігійны фанатызм, распад шматнацыянальных дзяржаў, нацыянальны эгаізм і інш. Этнацыянальныя канфлікты на тэрыторыі былога СССР і Югаславіі, у іншых рэгіёнах свету. Сучасныя тэрытарыяльныя канфлікты. Блізкаўсходні канфлікт.

Палітыка дыктатарскіх рэжымаў як фактар нестабільнасці ў міжнародных адносінах. Міжнародны тэрарызм і праблемы яго пераадолення.

Новая роля НАТО ў сусветнай палітыцы. Войны ЗША і іх саюзнікаў у Іраку, Афганістане. Сучасныя праблемы глабалізацыі. Роля ААН у сучасным свеце. Праблемы яе рэфармавання.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | КСР | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | семінарскія заняткі | | | |
| 1 | 2 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **1** | **Раздзел 1. Тэарэтычныя пытанні гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі.** | **4** | | | | | | |
| **1.1** | **Уводная: сутнасць міжнародных адносін, іх суб'екты і асноўныя фактары.**<br>1. Сутнасць знешняй палітыкі і міжнародных адносін. Дзяржава як іх галоўны суб'ект.<br>2. Асноўныя фактары знешняй палітыкі і міжнародных адносін (геаграфічныя, эканамічныя, фактар ваеннай сілы, культурныя і псіхалагічныя, этнавобразы і этнастэрэатыпы, маральныя фактары).<br>3. Геаграфія міжнародных адносін. | 2 | | | | | [1,3,39, 50,54] | |
| **1.2** | **Фарміраванне сістэмнасці ў міжнародных адносінах.**<br>1. Сістэмнасць у міжнародных адносінах як гістарычная з'ява. Нацыянальныя (агульнаграмадскія) інтарэсы – асноўны сістэмаўтвараючы фактар міжнародных адносін.<br>2. Міжнародная палітыка як сфера выяўлення суверэнітэта дзяржаў. Рэальная іерархія дзяржаў у міжнародных адносінах.<br>3. Гістарычныя формы сістэмы міжнародных адносін. Фактары інтэграцыі і дэзінтэграцыі сістэм.<br>4. Дыпламатыя і дыпламатычная служба. | 2 | | | | | [1,3,40, 55] | |
| **2** | **Раздзел 2. Версальска-Вашынгтонская сістэма як сістэма сусветнай палітыкі.** | **10** | | | **6** | **4** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.1** | **Міжнародныя адносіны на заключным этапе Першай сусветнай вайны. Пачатак фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.**<br>1. Першая сусветная вайна як выява крызісу індустрыяльнай цывілізацыі. Пошукі выйсця з яго. “14 пунктаў” прэзідэнта В. Вільсана.<br>2. Выхад Расіі з вайны. Страта ею тэрыторыі Фінляндыі, Прыбалтыкі, Украіны і Закаўказзя.<br>3. Выхад саюзнікаў Германіі з вайны. Распад Аўстра-Венгрыі.<br>4. Камп’енскае перамір’е і ануляванне Брэсцкага мірнага дагавора. | 2 | | | | | [9,23,45, 67,79] | |
| **2.2** | **Утварэнне Версальскай сістэмы міжнародных адносін. Версальская сістэма як незавершаны, пераходны тып сістэмы міжнародных адносін.**<br>1. Пазіцыі дзяржаў па пытаннях пасляваеннага мірнага ўрэгулявання. Утварэнне Лігі Нацый.<br>2. Германскае і польскае пытанні на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Іх рашэнне ў Версальскім дагаворы.<br>3. Мірныя дагаворы з саюзнікамі Германіі (Сен-Жэрменскі, Трнанонскі, Нейіскі, Сеўрскі). Тэрытарыяльна-палітычныя перамены ў Еўропе.<br>4. Германія і Савецкая Расія ў Версальскай сістэме. Версальская сістэма як незавершаны, пераходны тып сістэмы міжнародных адносін. | | | | | 2 | [9,22,23, 43,45] | |
| **2.3** | **Эвалюцыя Версальскай сістэмы ў сярэдзіне 1920-х гадоў.**<br>1. Суадносіны сіл у Еўропе і свеце пасля Парыжскай канферэнцыі. “Тылавыя” саюзы Францыі.<br>2. Рурскі крызіс і яго вынікі для міжнародных адносін.<br>3. Лакарнская канферэнцыя і яе рашэнні.<br>4. Змена пазіцый Германіі ў свеце. Яе ўступленне ў Лігу Нацый. | | | | 2 | | [19,23] | |
| **2.4** | **Заходні свет і Савецкая Расія (СССР) у еўрапейскай палітыцы ў першай палове 1920-х гадоў.**<br>1. “Мірная передышка” Савецкай Расіі ў 1919-1920 гг.у Паўночна-Заходняй Еўропе.<br>2. Польска-савецкая вайна і аднаўленне палітыкі экспарту | 2 | | | 2 | | [34,35, 36,42, 47,60] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рэвалюцыі. Рыжскі мір.<br>3. “Двухкалаёвая” савецкая знешняя палітыка ў 1920-я гады. Месца Германіі ў гэтай палітыцы.<br>4. Курс СССР на рэвалюцыю ў Германіі ў хлдзе Рурскага крызісу і яго правал і наступствы для савецкай знешняй палітыкі. | | | | | | | |
| **2.5** | **Фарміраванне Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін і яе эвалюцыя да пачатку 1930-х гадоў.**<br>1. Сітуацыя на Далёкім Усходзе пасля Першай сусветнай вайны. Вашынгтонская канферэнцыя 1921-1922 гг. і стварэнне Вашынгтонскай сістэмы.<br>2. Палітыка Савейкай Расіі (СССР) на Далёкім Усходзе і ў Кітаі ў 1920-я гады як фактар аслаблення Вашынгтонскай сістэмы.<br>3. Палітыка Японіі на Далёкім Усходзе. Пачатак яе агрэсіі супраць Кітая, утварэнне дзяржавы Маньчжоу-го.<br>4. Вашынгтонская сістэма як звяно (“плячо”) сусветнай сістэмы міжнародных адносін. | 2 | | | | | [23,26] | |
| **2.6** | **Міжнародныя адносіны ў Еўропе ў паслялакарнскі перыяд (1926 – 1932 гг).**<br>1. Лакарнскі працэс у другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гадоў. Барацьба Германіі за адмену асобных палажэнняў Версальскага дагавора.<br>2. Рапальская палітыка ў кантэксце Версаля. Яе “затуханне” ў пачатку 1930-х гадоў.<br>3. Праблема разбраення ў міжнародных адносінах у другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гадоў Канферэнцыя па разбраенню.<br>4. Тэрытарыяльна-нацыянальныя праблемы ў міжнародных адносінах. Пытанне аб польскім “калідоры”.<br>5. Прыкметы крызісу Версальскай сістэмы. | | | | | | [4,15, 16] | |
| **2.7** | **Ад палітыкі калектыўнай бяспекі да блокавай палітыкі (сярэдзіна – другая палова 1930-х гадоў).**<br>1. Устанаўленне фашысцкага рэжыму ў Германіі, яго знешнепалітычная праграма, метады і першыя крокі па рэалізацыі.<br>2. Паварот СССР да збліжэння з Захадам. Праект Усходняга | | | | | 2 | [9,13,43, 80] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | пакта. Дагаворы аб узаемнай дапамозе з Францыяй і Чэхаславакіяй.<br>3. Разрыў Германіяй абавязацельстваў, узятых па міжнародных дагаворах (1935, 1936 гг.).<br>4. Агрэсія Італіі супраць Эфіопіі і пазіцыя дзяржаў. Пачатак італа-германскага збліжэння.<br>5. Пазіцыя заходніх дзяржаў і СССР у сувязі з грамадзянскай вайной у Іспаніі.<br>6. Пачатак фарміравання агрэсіўных блокаў у 1936 – 1937 гг.<br>7. Характар палітыкі замірэння Германіі: яе мэты і вынікі ў 1933-1937 гг. | | | | | | | |
| **2.8** | **Міжнародныя адносіны на Далёкім Усходзе ў 1930-я гады.**<br>1. Расшырэнне Японіяй агрэсіі ў Кітаі. Пачатак шыракамаштабнай япона-кітайскай вайны (1937 г.).<br>2. Савецка-мангольскія і савецка-кітайскаія адносіны на фоне японскай агрэсіі ў Кітаі.<br>3. Брусельская канферэнцыя (лістапад 1937 г.) і крах Вашынгтонскай сістэмы. Пагадненне Арыта-Крэйгі 1939 г.<br>4. Абвастрэнне савецка-японскіх адносін у канцы 1930-х гадоў і яго еўрапейскі рэзананс. | 2 | | | | | [23,26, 80] | |
| **2.9** | **Крах Версальскай сістэмы ў канцы 1930-х гадоў .**<br>1. Аншлюс Аўстрыі Германіяй, яго ўплыў на сітуацыі ў Еўропе.<br>2. Чэхаславацкі крызіс 1938 г., пазіцыя заходніх дзяржаў, СССР і Польшчы.<br>3. Міжнародны палітычны крызіс 1939 г.<br>4. Англа-франка-савецкія палітычныя і ваенныя перагаворы 1939 г. Прычыны іх правала.<br>5. Выбар СССР на карысць дагавора з Германіяй, яго падрыхтоўка і падпісанне. Сакрэтны пратакол як яго інтэгральная частка.<br>6. Міжнароднае значэнне савецка-германскага дагавора. | 2 | | | 2 | | [10,33, 43,58, 71] | |
| **3** | **Раздзел 3. Міжнародныя адносіны ў перыяд і пасля Другой сусветнай вайны.** | **6** | | | **10** | **4** | | |
| **3.1** | **Міжнародныя адносіна на першым этапе Другой сусветнай вайны.** | 2 | | | 2 | | [21,27, 28] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Пачатак Другой сусветнай вайны і палітыка СССР. Савецка-германскі дагавор аб дружбе і граніцы.<br>2. Савецка-фінляндская вайна і яе міжнародныя вынікі.<br>3. Тэрытарыяльныя перамены ў Еўропе і свеце ў 1940-1941 гг.<br>4. Эвалюцыя пазіцыі ЗША на першым этапе Другой сусветнай вайны.<br>5. СССР паміж Германіяй і Захадам на першым этапе вайны. Правал савецка-германскіх перагавораў 1940 г. і нападзенне Германіі на СССР. | | | | | | | |
| **3.2** | **Міжнародныя адносіны ў 1941-1945 гг. Пачатак фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.**<br>1. Утварэнне антыгітлераўскай кааліцыі ў 1941-1942 гг.<br>2. Пытанне аб другім фронце ў Еўропе ў адносінах дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.<br>3. Пытанні пасляваеннага тэратарыяльна-палітычнага ўладкавання ў Еўропе ў адносінах дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі.<br>4. Раскол і аслабленне фашысцкага блока ў 1944 – пачатку 1945 г.<br>5. Узаемадзеянне заходніх саюзнікаў і СССР на заключным этапе вайны (ад Ялцінскай канферэнцыі да капітуляцыі Японіі). | | | | 2 | | [29,31, 44,46, 49,53] | |
| **3.3** | **Узнікненне двухполюснай сістэмы свету.**<br>1. Тэрытарыяльныя змены ў Еўропе і свеце пасля Другой сусветнай вайны. Новыя суадносіны сіл.<br>2. Утварэнне ААН, яе Статут і роля ў пасляваенным свеце.<br>3. Пытанне аб мірных дагаворах з Германіяй і яе саюзнікамі. Падпісанне дагавораў з еўрапейскімі саюзнікамі Германіі (1947 г.) і з Японіяй (1951 г.).<br>4. Пачатак халоднай вайны (1945 – 1947 гг.). Распад Германіі. | | | | 2 | | [5,19,22, 51,74] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.4 | **Міжнародныя адносіны ва ўмовах глабальнай канфрантацыі 1950-х – 1970-х гадоў.**<br>1.Утварэнне двух ваенна-палітычных блокаў. Германская праблема ў іх адносінах (да 1962 г.).<br>2. Глабальная канфрантацыя СССР і ЗША. Яе праўленне ў лакальных канфліктах.<br>3. Часовая разрадка міжнароднай напружнасці ў 1970-я гады, яе праяўленні ў Еўропе і ў свеце. Нарада ў Хельсінках 1975 г.<br>4. Увод савецкіх войск у Афганістан і канец палітыкі разрадкі. Гонка звычайных і ядзерных узброенняў. | 2 | | | | | [2,25,26, 80] | |
| 3.5 | **Глабальныя праблемы чалавецтва.**<br>1. Рост уплыву на палітыку масавых рухаў пасля Другой сусветнай вайны.<br>2. Сутнасць глабальных праблем. Праблема ядзернай катастрофы.<br>3. Праблема голаду і недахопу іншых рэсурсаў.<br>4. Экалагічная праблема і праблема масавых захворванняў.<br>5. Тэрарызм як глабальная праблема.<br>6. ААН і глабальныя праблемы. | | | | | 2 | [2,25,26, 70] | |
| 3.6 | **Распад двухполюснай сістэмы свету.**<br>1. Крызіс і распад сацыялістычных сістэм у краінах Усходняй Еўропы. Распад СССР.<br>2. Аб'яднанне Германіі. Адноўленне ёю суверэнітэта.<br>3. Ліквідацыя Арганізацыі Варшаўскага Дагавора і СЭУ (1991 г.).<br>4. Аднаполюсная сістэма свету, яе няўстойлівасць, праблема фарміравання многаполюснай сістэмы на сучасным этапе. | 2 | | | 2 | | [26,61, 80] | |
| 3.7 | **Еўрапейская і сусветная інтэграцыя (да пачатку 20 ст.).**<br>1. Рухаючыя фактары еўрапейскай інтэграцыі, яе этапы. Маастрыхцкі працэс.<br>2. Інтэграцыя былых сацыялістычных краін і міжнародныя структуры. Рэспубліка Беларусь і еўрапейская інтэграцыя.<br>3. Інстытуты міжнароднага супрацоўніцтва на сучасным этапе: Сусветная гандлевая арганізацыя, Міжнародны валютны фонд і інш.<br>4. Праблема ўстойлівага міжнароднага развіцця на сучасным | | | | 2 | 2 | [17,24, 26,80] | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | этапе. Роля ААН, праблема яе фарміравання. | | | | | | | |
| | ***Усяго:*** | **20** | | | **16** | **8** | | **Залік** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### *Пералік практычных заняткаў*

1. Эвалюцыя Версальскай сістэмы ў сярэдзіне 1920-х гадоў.
2. Заходні свет і Савецкая Расія (СССР) у еўрапейскай палітыцы ў першай палове 1920-х гадоў.
3. Крах Версальскай сістэмы ў канцы 1930-х гадоў .
4. Міжнародныя адносіна на першым этапе Другой сусветнай вайны.
5. Міжнародныя адносіны ў 1941- 1945 гг. Пачатак фарміравання новай сістэмы міжнародных адносін.
6. Узнікненне двухполюснай сістэмы свету.
7. Распад двухполюснай сістэмы свету.
8. Еўрапейская і сусветная інтэграцыя (да пачатку 20 ст.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## *Літаратура*

**Асноўная**


1. Гаджиев К.С. Введение в политическую науку: Учеб. для вузов. – М., 1997.
2. Лазько Р.Р. Навейшая гісторыя краін Еўропы і Амерыкі: 1945-1999 гг. – Гомель, 2000.
3. Цыганков П.А. Международные отношения: Учеб. пособие для вузов – М., 1996.


**Дадатковая**


4. Ахтамзян, А. А. Рапалльская политика. Советско-германские отношения 1922—1932 гг. / А. А. Ахтамзян. М., 1974.
5. Берге, И.В. Историческое недоразумение? “Холодная война” 1917-1990. – М., 1996.
6. Бессарабия на перекрестке европейской дипломатии: Документы и материалы / Отв. ред. В.Н. Виноградов. – М.: Индрик, 1996. – 380 с.
7. Волаціч, М. Лінія Керзона на фоне падзей і тэрытарыяльных змен ва Усходняй Еуропе / М. Волаціч // Спадчына. 1993. № 5—6.
8. Горохов, В. Н. История международных отношений: 1918—1939 : курс лекций / В. Н. Горохов. М., 2004.
9. Горохов, В.Н. История международных отношений. 1918-1939: Курс лекций. – М.: Из-во Моск. Ун-та, 2004. - 288 с.
10. Документы внешней политики СССР : в 22 т. Т. 16-1-ХII. 1933. М., 1970; Т. 17-Г-ХII. 1934. М., 1971; Т. 18-I-ХII. 1935. М., 1973; Т. 19-I-ХII. 1936. М., 1974; Т. 20-I-ХII. 1937. М., 1976; Т. 21-ХII. 1938. М., 1977; Т. 22, кн. 1-I-VIII. 1939. М., 1992. Т.23
11. Документы и материалы кануна второй мировой войны (1937—1939): в 2 т. М., 1981.
12. Документы и материалы кануна второй мировой войны: Из архивов МИД Германии. - М., 1948.
13. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 12 т. Т. 6: 1933—1938. - М., 1969; Т. 7: 1939—1943. - М., 1973; Т. 8: 1944 - 1945. - М., 1974.
14. Документы по истории мюнхенского сговора. 1937 - 1939. - М., 1979.
15. Дьяков, Ю.Л. Фашистский меч ковался в СССР: Красная армия и рейхсвер. Тайное сотрудничество. 1922-1933. Неизвестные документы. / Ю.Л. Дьяков, Т.С. Бушуева. – М.: Сов. Россия, 1992. – 384 с.
16. Европа в международных отношениях. 1917—1939 / ред. А. Чубарьян. - М., 1979.
17. Европейский Союз: история, политика, экономика, право. – Мн., 1998.
18. Загладин, Н. В. История успехов и неудач советской дипломатии / [. В. Загладин. - М., 1990.
19. Загладин, Н.В. История успехов и неудач советской дипломатии. – М, 1990.
20. Загладин, Н.В. Новый мировой беспорядок и внешняя политика России // Мировая экономика и международные отношения. – 2000, №1.
21. Зимняя война. 1939—1940. Кн. 1 : Политическая история. Кн. 2 : И. В. Сталин и финская кампания. - М., 1999.
22. Илюхина, Р. Лига Наций. 1919—1934 / Р. Илюхина.- М., 1982.
23. История дипломатии : в 5 т. Т. 3. - М., 1965. Т. 4. - М., 1975. Т. 5 .
24. История европейской интеграции (1945-1994). – М., 1995.
25. Кальвокоресси, П. Мировая политика после 1945 года. – М., 2000.
26. Киссинджер, Г. Дипломатия / Г. Киссинджер; пер. с англ. В. В. Львова ; послесл. Г. А. Арбатова. - М., 1997.
27. Коминтерн и вторая мировая война. Ч. 1 : До 22 июня 1941 г.; Ч. 2 : После 22 июня 1941 г. - М., 1994, 1998.

28. Коминтерн и идея мировой революции: Документы / РАН. Ин-т всеобщ. истории; Федер. архив. служба России; Рос. центр хранения и изуч. док. новейшей истории. Сост. Я.С. Драбкин и др. – М.: Наука. 1998. – 949.
29. Конференция Объединенных наций в Сан-Франциско. Т. 5. - М., 1984.
30. Кортунов, С. “Имперское” и национальное в российском сознании. – Международная жизнь, 1998, №6.
31. Крымская конференция трех союзных держав — СССР, США и Великобритании. Т. 4. - М., 1984.
32. Лазько Р.Р. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914 -1991 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў / склад. А.Ф. Вялікі, Р.Р. Лазько [і інш.]; рэдкал.: С.М. Мартынаў, Р.Р. Лазько [і інш.] // Зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т. Т. 1. 1 жніўня 1914 - 18 сакавіка 1921 гг., ч. 1. 1 жніўня 1914 - 31 снежня 1919 гг.; ч. 2. 3 студзеня 1920 - 18 сакавіка 1921 гг. - Мінск: Юніпак, 2008.
33. Лазько Р.Р. Крах версальскай сістэмы ў Еўропе і аб’яднанне Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. - №11. – С. 3-7.
34. Лазько, Р. Р. Перад патопам: Еурапейская палітыка Польшчы. 1932—1939 гг. / Р.Р. Лазько. - Мн., 2000.
35. Лазько, Р.Р. Беларусь у еўрапейскай палітыцы. 1918-1925 гг. Нарысы. / Р.Р. Лазько, А.М. Кротаў, М.М. Мязга. – Гомель, 2003.
36. Ленин, В.И. Неизвестные документы. 1891-1922 гг. – М.: РОССПЭН, 2000. – 607.
37. Ллойд-Джордж, Д. Правда о мирных переговорах / Д. Ллойд-Джордж. Т. 1—2. - М., 1957.
38. Майский, И. М. Воспоминания советского дипломата. 1925—1945 / И. М. Майский. - М., 1987.
39. Маккиндер, Х. Дж. Географическая ось истории // Полис – 1995, №4.
40. Маныкин, А.С. Системность в международных отношениях: причины формирования и этапы развития // Вестник МГУ. Сер 8: История. – М., 1992, №6.
41. Материалы «Особой папки» Политбюро ЦК РКП(б)-ВКП(б) по вопросу советско-польских отношений, 1923-1944 гг. / РАН. Ин-т славяноведения и балканистики и др. Ред. И.И. Костюшко. – М., 1997. – 142 с.
42. Мезга Н.Н. В тисках Рапалло: германский фактор в польско-советских отношениях 1921 – 1926 годов. - Гомель: УО “ГГУ им. Ф. Скорины”, 2010. – 198 с.
43. Мир между войнами. Избранные документы по истории международных отношений 1910-1940-х годов / Моск. гос. ин-т междунар. отношений (ун-т) МИД РФ. Сост. А.В. Мальгин; Отв. ред. А.Д. Богатуров. – М., 1997. – 301 с.
44. Мировые войны XX века : в 4 кн. Кн. 3 : Вторая мировая война : ист. очерк / отв. ред. Е. Н. Кульков. - М, 2002.
45. Мировые войны XX века: В 4 кн. Кн. 2. Первая мировая война. Документы и материалы / РАН. Ин-т всеобщей истории. Научн. ред. Б.М. Туполев; Отв. ред. В.К. Шацилло; Сост. А.П. Жилин. – М.,: Наука, 2002. – 581 с.
46. Мировые войны XX века: В 4 кн. Кн. 4. Вторая мировая война. Документы и материалы / РАН. Ин-т всеобщей истории. Отв. Ред. М.Ю. Мягков; Сост. Ю.А. Никифоров. – М.: Наука, 2002. – 677 с.
47. Михутина, И. В. Польско-советская война 1919—1920 гг. / И. В. Михутина. М., 1994.
48. Морозов, Г. И. Лига Наций: взгляд через полвека / Г. И. Морозов // Вопр. истории. 1992. № 2—3.
49. Московская конференция министров иностранных дел СССР, США и Великобритании. Т. 1. - М., 1979.
50. Мурадян А.А. Самая благородная наука. Об основных понятиях международно-политической теории. – М., 1990.
51. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками : сб. материалов : в 3 т. Т. 1. - М., 1965; Т. 2. - М., 1966; Т. 3. - М, 1966.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

52. От пакта Молотова-Риббентропа до договора о базах: Документы и материалы: Пер. с эст. / Сост. К. Арьянас и др. – Таллин: Периодика, 1990. – 214 с.
53. 'Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941 — 1945 гг.: в 2 т. - М., 1989.
54. Поздняков, Э.А. Внешнеполитическая деятельность и межгосударственные отношения. – М., 1986.
55. Поздняков, Э.А. Нация. Национализм. Национальные интересы. – М., 1994.
56. Политбюро ЦК РКП (б)-ВКП(б) и Европа. Решения “особой папки”. 1923-1939 / РАН. Ин-т всеобщей истории. Редкол.: Г. Адибеков и др. – М.: РОССПЭН, 2001. – 400 с.
57. Полпреды сообщают... : сб. документов об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией: Август 1939 — август 1940 гг. - М., 1990.
58. Полпреды сообщают: Сборник документов об отношениях СССР с Латвией, Литвой и Эстонией, август 1939 – август 1940 г. / М-во иностр. дел СССР. Редкол.: В.Г, Комплектов (пред.) и др. – М.: Международные отношения, 1990. – 541 с.
59. Польско-советская война, 1919 - 1920. Ранее не опубликованные документы и материалы. Ч. 1—2. - М., 1994.
60. Польско-советская война, 1919-1920: Ранее не опубликованные документы и материалы / РАН. Ин-т славяноведения и балканистики и др. Сост. И.И. Костюшко. В 2 ч. – М., 1994.
61. Салмин, А.М. Россия, Европа и новый мировой порядок // Полис. – 1999, №2.
62. Секреты Гитлера на столе у Сталина : Разведка и контрразведка о подготовке германской агрессии против СССР. М., 1995.
63. Системная история международных отношей. События и документы. 1918-2000: В 4 т. Т. 2. Документы 1910-1940-х гг. / Сост. А.В. Мальгин; Отв. ред. А.Д. Богатуров. – М.: Моск. рабочий, 2000. – 243 с.
64. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. : сб. документов : в 6 т. М., 1978— 1980.
65. Советско-американские отношения во время Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. : документы и материалы : в 2 т. М., 1984.
66. Советско-английские отношения во время Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. : документы и материалы : в 2 т. М., 1983.
67. Советско-гермнские отношения от переговоров в Брес-Литовске до Рапалльского договора: Сборник документов / М-во иностр. дел СССР; М-во иностр. дел ГДР. Редкол.: С. Дёрнберг и др.: В 2 т. – М.: Политиздат, 1968.
68. Советско-румынские отношения, 1917-1941: Документы и материалы / М-во иностр. дел Рос. Федерации; М-во иностр. дел Румынии. Редкол.: А.А. Авдеев, М.Р. Унгуряну и др.: В 2 т. – М.:Международные отношения, 2000.
69. Советско-французские отношения во время Великой Отечественной войны 1941—1945 ; документы и материалы : в 2 т. М., 1983.
70. Современные международные экономические отношения: Учеб. пособие / Под общей ред. В.К. Матюшевской – Мн., 2003.
71. СССР — Германия 1939. Т. 1 ; Документы и материалы о советско-германских отношениях с апреля по октябрь 1939 г. Вильнюс, 1989.
72. СССР — Германия 1939. Т. 2 : Документы и материалы о советско-германских отношениях с сентября 1939 г. по июнь 1941 г. Вильнюс, 1989.
73. СССР в борьбе за мир накануне второй мировой войны (сентябрь 1938 — август 1939 гг.). Документы и материалы. М., 1971.
74. СССР и германский вопрос, 1941—1949 : документы из Архива внешней политики Российской Федерации ; в 2 т. Т. 1 (22 июня 1941 — 8 мая 1945 г.). М., 1996.
75. СССР-Германия 1939-1941 гг.Документы и материалы о советско-германских отношениях с сентября 1939 г. по июнь 1941 г.: В 2 т. – Вильнюс: Мокслас, 1989.
76. Челядинский, А.А. Теория международных отношений: Курс лекций. – Мн., 2004.

77. Черчилль, У. Вторая мировая война : в 3 кн. / У. Черчилль. М., 1991. Шервуд, Р. Рузвельт и Гопкинс: Глазами очевидца / Р. Шервуд; пер. с англ. : в 2 т. М., 1958.
78. Чичерин, Г.В. Статьи и речи по вопросам международной политики / Сост. Л.И. Трифомова. – М.: Соцэкгиз, 1961. – 516 с.
79. Шацилло, В.К. Первая мировая война 1914-1918 гг. Факты. Документы. – М.: ОЛМА-пресс, 2003. – 480 с.
80. Эннио Ди Нольфо. История международных отношений (1918-1999 гг.): Пер. с итал. / Моск. гос. ин-т междунар. отношений (ун-т) МИД РФ; ИНО-Центр.; Под ред. М.М. Наринского: В 2 т. Т. 1. 1918-1945. – М.: Логос, 2003. – 592 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ